# Гэты бурапенны "Маладняк"

**У вялікім асветніцкім праекце "На хвалі часу, у плыні жыцця", які рэалізавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі разам з іншымі партнёрамі, паўдзельнічалі некаторыя сярэднія школы. Каштоўныя матэрыялы віртуальнага праекта даступныя на партале НББ.**



На імпрэзе ў Нацыянальнай бібліятэцы выступаюць удзельніцы народнага літаратурнага тэатра "Жывое слова".

Літаратурная імпрэза была прымеркавана да 100-годдзя ўтварэння Усебеларускага літаб'яднання паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк" (1923—1928). Нагадаем, гэта была першая прафесійная беларуская літсуполка творчай моладзі. Сёння знаўцы прыгожага пісьменства называюць яе ўнікальнай, падкрэсліваюць значную ролю аб'яднання ў развіцці айчыннай літаратуры. Творчыя пошукі, смелыя ідэі, бадзёрасць, "бурапеннасць" і новыя формы мастацкага выказвання, імкненне будаваць новы свет — усё гэта на рэвалюцыйнай хвалі захапіла апантаных юнакоў і дзяўчат. Прычым і розгалас быў немалы: спачатку невялікі гурток энтузіястаў хутка аб'яднаў больш за 300 творцаў з розных гарадоў Беларусі і нават суседніх краін. І гэта, вядома ж, стала выключнай падзеяй у грамадстве, важным крокам для наладжвання літаратурных сувязей, развіцця шырокай асветніцкай дзейнасці.

Па сутнасці, тыя нямногія "маладнякоўцы", якіх мы сёння ведаем, — гэта ўсяго толькі надводная частка велізарнага беларускага літайсберга. Праз "Маладняк" ішлі ў літаратуру Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Уладзімір Дубоўка, Міхась Зарэцкі, Язэп Пушча, Пятрусь Броўка і многія іншыя. На імпрэзе ў НББ адзначалася: для ўдзельнікаў суполка была своеасаблівай творчай школай, дзе яны рабілі першыя крокі ў літаратурнае жыццё.

Сярод "маладнякоўцаў" былі таксама і педагогі па адукацыі. Варта заўважыць, што да пісьменніка-настаўніка Якуба Коласа, напрыклад, у маладзейшых спачатку было крыху задзірыстае стаўленне — як да старога. І Янка Купала спярша быў ім не ў прыклад… Але ўрэшце тыя "дзіцячыя хваробы" прайшлі. Бо рабілі ж усе агульную асветніцкую справу, а, як вядома, на гэтай ніве ўсім хапае месца і практычна няма меж паміж адукацыяй, шырокім асветніцтвам і культурай. Кожны настаўнік — асветнік, калі ён творца ў прафесіі, а не проста прадметнік, калі ўплывае на фарміраванне светапогляду сваіх вучняў.

У час літімпрэзы "На хвалі "Маладняка" абагульняліся вынікі сумеснага праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця", які рэалізуюць Нацыянальная бібліятэка, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва і Выдавецкі дом "Звязда". Таксама адбылася прэзентацыя новага віртуальнага раздзела, прысвечанага 115-й гадавіне Яўгеніі Пфляўмбаўм (1908—1996) — паэтэсы, перакладчыцы, якая ўваходзіла ў кіраўніцтва "Маладняка". На імпрэзе выступаў генеральны дырэктар НББ Вадзім Гігін, у ёй прынялі ўдзел даследчыкі літаратуры, спецыялісты архіваў, музеяў, бібліятэк, устаноў адукацыі, прадстаўнікі СМІ. Упрыгожылі сяброўскую сустрэчу выступленні ўдзельніц народнага літаратурнага тэатра "Жывое слова" Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

> На імпрэзе адзначалася: каштоўныя маладнякоўскія матэрыялы, сабраныя даследчыкамі за 5 гадоў, цяпер даступныя ўсім на партале НББ.

Да асветніцкага праекта падключыліся і школы краіны. Гэта, у прыватнасці, 1-я школа Мядзела імя Уладзіміра Дубоўкі, у якой у 1990 годзе быў адкрыты музей гісторыі школы (ён таксама носіць імя пісьменніка) і дзейнічае як філіял Мядзельскага музея народнай славы. Частка музейнай экспазіцыі — гэта выданні і рукапісы Уладзіміра Дубоўкі, яго фатаграфіі, асабістыя рэчы. Там НББ раней прэзентавала прысвечаную пісьменніку віртуальную экспазіцыю.

У Цімкавіцкай сярэдняй школе, што на Капыльшчыне, ладзілася літаратурна-музычная імпрэза "Пісьменнік вялікай душы" ў памяць пра Кузьму Чорнага, з прэзентацыяй віртуальнай экспазіцыі, прысвечанай яму. Удзельнікі праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" наведалі гістарычна-краязнаўчы музей "Бацькаўшчына", што ў Каменскай сярэдняй школе на Капыльшчыне. У музеі дзейнічае пастаянная экспазіцыя, прысвечаная пісьменніку Яну Скрыгану — аднаму з актыўных удзельнікаў суполкі "Маладняк". Паездка ладзілася сумесна з яго дачкой, Галінай Іванаўнай Скрыган, з нагоды 30-годдзя з дня смерці пісьменніка.

У Паставах шануюць Уладзіміра Дубоўку, імем якога назвалі адну з вуліц. Пастаўскай дзіцячай бібліятэцы было нададзена імя паэта-земляка, у яго гонар адкрыта мемарыяльная дошка на будынку бібліятэкі.

**Іван ЖДАНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**